# ВОБРАЗ «МАЛОЙ РАДЗІМЫ» Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА

***К. В. Каляда***

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца спецыфіка мастацкага ўвасаблення «малой радзімы» ў лірыцы Максіма Танка, вызначаюцца дамінантныя вобразы і матывы, звязаныя з Нарачанскім краем.

**Ключавыя словы:** «малая радзіма»; грамадзянская лірыка; вобраз; матыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З той пары, калі з сэрца маладога Максіма Танка трывожна прараслі першыя вершы, прайшло амаль стагоддзе, у творчым жыцці паэта адлюстравалася безліч дарог-этапаў, дарог-выпрабаванняў – ланцужных, вогненных, актыўна-грамадзянскіх. Але самай галоўнай з усіх мастакоўскіх «сцежак-дарожак» стала дарога-вяртанне ў родны край, на малую радзіму, Нарачаншчыну.

Нездарма ў свядомасці чытачоў трывала замацавалася ўяўленне: каб разгадаць таямніцу пісьменніка, трэба пабываць у яго на радзіме. Паэзія М. Танка ўвабрала ў сябе адметнасць народнага светабачання і светаразумення, спецыфічны дух мовы, фалькларызм, народную памяць, тыповы для ўзбярэжжа Нарачы беларускі пейзаж – імшыстыя ўзгоркі, карабельныя сосны, спрадвечныя валуны, імклівыя рэкі, чысцюткія азёры. салёны мядзельскі вецер.

Славуты нарачанскі край… Усё тут тыповае для Беларусі: клімат, прырода, ландшафт. Але ёсць і нешта невыказальна-чароўнае, што асабліва вабіць, захапляе прыгажосцю і пяшчотай, уражвае глыбокай філасофіяй існавання.

Нарачанская зямля ўваходзіць у свет паэзіі М. Танка праз вершы «Мядзельскі вецер», «Парог, вычасаны з успамінаў…», «Імглой», «Пад мачтай», «У азёрнай старонцы маёй», «Зара над Нараччу», «На шалях азёр», паэмы «Нарач» і інш.

Канцэпт «малая радзіма» складаецца ў М. Танка з наступных вобразных дамінант: возера (ціхія тоні якога адлюстроўваюць сталёвы нарог месяца), сасна (даўнейшая сяброўка), бярозы ля студні (дзяўчаты-сяброўкі. што

перадаюць адна адной сакрэты), наднарачанскія зоры і аблокі, дарога, што вядзе дадому («*Дарога, закалыханая жытам…*»), якая не толькі калыхала маленства будучага паэта, але і звязвала свет паэта з бацькоўская зямлёй, лёсам, вечнасцю.

Любоў да малой радзімы пачыналася ў М. Танка з парога як сакральнага сімвала, што з'ядноўвае мінулае і будучыню, з'яўляецца мяжой адначасна і сталення (сыходу ў вялікі свет), і вяртання да жменькі роднай зямлі, шуму Нарачы, шэлесту дубровы:

*Парог, вычасаны з успамінаў,*
*Астаўся за мной;*
*Дзверы, на завесах цвыркуновай песні,*
*Асталіся за мной;*
*Вокны, зашклёныя вачамі блізкіх,*
*Асталіся за мной;*
*Хата, пакрытая крыламі ластавак,*
*Асталася за мной, –*

*Як жа мне не азірнуцца назад,*
*Нават калі б я застыў*
*Слупом солі?* [1, с. 100]

Верш уяўляе сабой узор патрыятычнай лірыкі. Ён пра невымерную любоў да роднага кута, сваёй бацькаўшчыны, радзімы. У вершы спалучаюцца рытміка-інтанацыйныя магчымасці верлібра і яскравая асацыятыўная вобразнасць («*Парог, вычасаны з успамінаў*», «*вокны зашклёныя вачамі блізкіх*», «*хата, пакрытая крыламі ластавак*» і г.д.).

Адным з самых яскравых вобразаў у вершах пра малую радзіму стаў вобраз азёрных шаляў, якія аб'ядноўваюць азёры і рэкі, неба і зямлю, паветраную і водную стыхіі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*І так хістаюцца шалі азёр*
*Ад хмар і вясёлак,*
*Ад сонца і зор.*

*Колькі разоў на гэтых шалях*
*Узважваліся*
*І маё сэрца і маі песні!* [1, с. 225]

## *Літаратура*

1. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва…: выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ